*На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...*
Якуб Колас

Народная Воля

№ 166 (748)
Чацвер, 9 верасня 1999 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Кошт: у кіёсках і крамах — 20000 руб., па падпісцы — 11000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Александр Старикевич, «Новые Известия»

«Остров Крым» стал для Лукашенко запретной зоной

Белорусский и украинский президенты в телефонном разговоре обменялись непарламентскими выражениями

10 сентября в Ялте состоится встреча представителей двадцати государств Балтийского и Черноморского регионов. Предполагалось, что в ней примет участие и руководитель Белоруссии Александр Лукашенко. Однако направленное ему приглашение аннулировано, и это только первый снегирь, возвещающий о серьезном похолодании в отношениях Европы и официального Минска.

Встреча эта станет продолжением форума, начало которому было положено два года назад в Вильнюсе. Мероприятие и тогда носило достаточно представительный характер: к примеру, Россию на нем представлял премьер-министр Виктор Черномырдин. Ныне к двенадцати участникам литовского рандеву присоединятся еще восемь. Проблемы существуют только в отношении Белоруссии.

Лукашенко, как водится, ухитрился отличиться во время первого вильнюсского раунда, на который его еще приглашали. Тогда неведомо откуда всплыла анекдотичная история о якобы готовящемся на него в Литве покушении. Нелепость этой утки была настолько очевидной, что о ней сегодня предпочитает не вспоминать даже сам Лукашенко. Тем не менее скандал, связанный с его появлением, запомнился.

Кучма и Лукашенко не всегда находят общий язык.

Однако не это стало причиной отзыва ранее направленного приглашения. Против присутствия Лукашенко резко выступили ряд участников встречи, по мнению которых он несмотря на искусственную пролонгацию полномочий с 21 июля 1999 года не может считаться легитимным президентом Белоруссии. Особо жесткую позицию заняла Норвегия, которая в этом году председательствует в ОБСЕ. В результате Лукашенко получил увесистую оплеуху, ибо вычеркивание из списка приглашенных гораздо неприятнее, чем изначальное невключение в него.

Для белорусского руководителя вдвойне обидно, что этот подарок к своему 45-летию он получил от президента Украины Леонида Кучмы, который является принимающей стороной (ладно, когда «оплот мирового империализма» делает тебя невъездным, гораздо обиднее, когда аналогичные меры предпринимает сосед, с которым в мировой табели о ранге находишься примерно на одном уровне).

По сведениям из заслуживающих доверие источников, в их телефонном разговоре не обошлось без непарламентских выражений. Разобидевшийся, Лукашенко отменил запланированную на 3 сентября встречу с Кучмой в Бресте, на которой ранее сам основательно настаивал. МИД Белоруссии в очередной раз дано поручение организовать визит первого лица хоть куда-нибудь, чтобы иметь возможность торжественно заявить о прорыве внешнеполитической блокады.

Тем временем еще один малоприятный сюрприз для Лукашенко организовали глава Рады Белорусской Народной Республики, имеющей статус правительства в изгнании, Ивонка Сурвилла, первый руководитель независимой Республики Беларусь Станислав Шушкевич, спикер Верховного совета 12-го созыва Мечеслав Гриб, подпись которого стоит под текстом белорусской Конституции, и президент «Згуртавання белорусов мира» Радим Горецкий. Каждый из этих людей является в своем роде символом белорусской государственности, и все они подписали обращение к народу Белоруссии, всем белорусам мира, парламентам и правительствам демократических государств. В этом документе констатируется, что, согласно Конституции Белоруссии, в связи с истечением срока полномочий Лукашенко в настоящее время обязанности президента перешли к председателю Верховного совета Семену Шарецкому. В связи с тем, что Лукашенко, используя антиконституционные методы, продолжает удерживать власть, подписанты призвали белорусский народ способствовать восстановлению в стране законной власти, а международное сообщество — не признавать узурпатора и содействовать развитию демократии в Белоруссии.

Все это происходит на фоне тягостной экономической ситуации. Под чутким руководством Лукашенко, который лично бороздил колхозные поля Белоруссии, в этом году несмотря на неплохие погодные условия собрали мизерный урожай – 3,7 миллиона тонн зерна при потребности почти втрое больше (год назад, кстати, было 4,8 миллиона тонн; два года – 6,4 миллиона тонн). Чиновники уже сейчас хватаются за голову, мрачно прогнозируя, что ближе к зиме возникнет страшный дефицит элементарных продуктов: масла, яиц, а возможно, и хлеба. Доллар взял очередную высоту. Сегодня он стоит 500 тысяч белорусских рублей. Между тем еще полгода назад Александр Лукашенко обещал народу к 1 октября всеобщую сытость и выход из экономического кризиса.

Минск.

Сход дэпутатаў Вярхоўнага Савета Беларусі 13-га склікання прызначаны на 18—19 верасня

Чарговы сход дэпутатаў Вярхоўнага Савета Беларусі 13-га склікання пройдзе ў два этапы: 18 верасня дэпутаты будуць працаваць у камісіях і фракцыях, а на наступны дзень прызначана пленарнае пасяджэнне. 19 верасня, паводле задумы арганізатараў, на пасяджэнне збяруцца каля 400 чалавек. Гэта цяперашнія дэпутаты, іх папярэднікі — парламентарыі Вярхоўнага Савета Беларусі 12-га склікання, члены папярэдняга складу Канстытуцыйнага суда краіны, лідэры партыйных і грамадскіх арганізацый, прадстаўнікі незалежных прафсаюзаў, працоўных калектываў, а таксама замежныя госці. Прэзідыум прапаноўвае ў парадак дня рабочага сходу ўключыць два асноўныя пытанні — даклад старшыні мандатнай камісіі Мечаслава Грыба і даклад Віктара Ганчара "Аб палітычных выніках пяцігадовага праўлення краінай Аляксандра Лукашэнкі".

Уладзімір ГЛОД.

"Нет!" — административному нажиму и запугиваниям

Трудовыми коллективами, общественностью с пониманием встречено решение о проведении 30 сентября 1999 года в г.Минске и областных центрах республики шествий-митингов против наступления на социально-экономические права трудящихся, снижения уровня жизни населения. Это решение принято по предложению профессиональных союзов, входящих в ФПБ, и его реализация находится в полном соответствии с нормами Конституции, Закона "О профессиональный союзах" и другими актами законодательства Республики Беларусь. Намеченная акция — обоснованный, выстраданный ответ на действия и решения, ущемляющие права граждан, на нарушения условий Генерального, отраслевых и местных соглашений, коллективных договоров теми, кто не желает корректировать социально-экономический курс в соответствии с интересами народа, требованиями, неоднократно выдвигавшимися профессиональными союзами, по изменению к лучшему бедственного положения подавляющего большинства людей труда.

К сожалению, власти и находящиеся у них под контролем средства массовой информации, руководители ряда государственных предприятий, стремясь сорвать акцию протеста, прибегают к тактике нажима и запугивания, к домыслам и угрозам в отношении профсоюзов и их лидеров.

Президиум Совета ФПБ решительно осуждает такого рода противоправные, антидемократические действия и требует уважения и соблюдения конституционных, правовых гарантий законной деятельности профессиональных союзов страны.

Мы призываем всех членом профсоюзов не поддаваться угрозам и запугиванию, продемонстрировать 30 сентября высокую активность, солидарность, единство в отстаивании своих прав и законных интересов.

Президиум Совета Федерации профсоюзов.

Незалежная экспертыза

Уладзімір КУЛАЖАНКА, доктар эканамічных навук, прафесар

Чым выклікана з'яўленне пяцімільённай грашовай купюры?

Сярод шэрагу падзей апошняга часу, безумоўна, значнай з'яўляецца паведамленне Нацбанка пра тое, што ў абарачэнне ўводзіцца разліковы білет вартасцю пяць мільёнаў рублёў. У гэтым годзе гэта другі крок дзяржавы па выпуску буйных купюр. Першы адбыўся вясною. Ён быў выкліканы ўзлётам інфляцыі, калі не хапала больш дробных грошай, каб абслужыць тавараабарот, хоць у абарачэнні ўжо былі 500-тысячныя грашовыя купюры. Цяперашні выпуск 5-мільённай грашовай адзінкі прынцыпова адрозніваецца ад папярэдніх (калі ўсе, нават бедныя людзі, сталі мільянерамі) тым, што гэтым крокам самой дзяржавай прагназіруецца бліжэйшы ўзлёт інфляцыі. І ён непазбежны, бо трэба ажыццяўляць масавыя закупкі збожжа, на што трэба мець сотні мільёнаў долараў, якіх няма. З патрэбных 163 мільёнаў тон мазуту для асенне-зімовага ацяплення жылля толькі на апошнія дні была назапашана чацвёртая частка — 440 тысяч тон. Плюс да гэтага непагашаная запазычанасць за газ — зноў сотні мільёнаў долараў.

Што з гэтага вынікае? Толькі адно: дзяржава збіраецца за кошт інфляцыйнай нацэнкі зацыраваць дзіркі ў татальнай запазычанасці. Зразумела, усё гэта прывядзе да далейшага зніжэння жыццёвага ўзроўню народа.

А што чакае праз месяц, два, тры, пяць? Толькі адно — грашовая рэформа. Яна становіцца проста непазбежнай.

Як вядома, пяцімільённую купюру надрукавалі даўно. Але яна не ўводзілася ў абарачэнне з-за таго, што ў кіраўнікоў дзяржавы была надзея праз увядзенне ў абарачэнне расійскага рубля нейкім чынам ліквідаваць за кошт суседзяў усе віды запазычанасці. Але ў Расіі зразумелі гэты манеўр і адмовіліся ад неадкладнага аб'яднання грошай. З гэтай прычыны Аляксандр Лукашэнка пры наведванні ў канцы жніўня новага аўтавакзала "Маскоўскі" заявіў, што падрыхтоўчы перыяд увядзення агульнай разліковай адзінкі кшталту "еўра" прадоўжыцца 8—10 гадоў. Таму ўрад, маўляў, ажыццяўляе комплекс мер па ўмацаванні нацыянальнага рубля. Але ўсім зразумела, што ўвядзенне ў абарачэнне пяцімільённай купюры не ёсць умацаванне рубля, бо калі будуць пяцімільённыя грошы, то з'явяцца, вобразна кажучы, і пяцімільённыя цэны. Значыць, урад усё ж плануе грашовую рэформу.

Аналіз паказвае, што ў адным ланцугу з развадненнем грошай могуць быць і іншыя падзеі. Амаль знікла з продажу сметанковае масла. Спажыўцы ведаюць, што гэта прадвеснік росту цэн на гэты прадукт. Між іншым, шакаладнае, дзе, пэўна, болей цукру, чым тлушчу, можна купіць, але цана сiганула за мільён рублёў. Відавочна, што для нашых бедных мільянераў уводзяцца, як кажуць, і мільённыя цэны.

У адзіным ланцугу з увядзеннем пяцімільённай купюры знаходзіцца і такая непрыемная навіна, як рашэнне ўладных структур перагнаць тысячы і тысячы галоў жывёлы з Віцебскай вобласці ў Гродзенскую, ратуючы яе ад бяскорміцы. Чакаць пры гэтым прыбаўкі малака і мяса, вядома, нельга. Адсюль дэфіцыт і рост цэн. Вось дзе прычына ўвядзення ў абарачэнне пяцімільёнай грашовай купюры.

Беларусь глазами молодых

Белорусская ассоциация молодых политиков совместно с Минским международным образовательным центром проводит постоянно действующий "круглый стол" под общим названием "Беларусь глазами молодых".

Очередное заседание состоится 17 сентября 1999 года в 18.00 по адресу: **Минск, пр-т газеты "Правда", 11.** Тема "круглого стола": "Власть и оппозиция: перспективы переговорного процесса". Для участия в дискуссии приглашены представитель правительства в переговорном процессе М.Сазонов, депутат Верховного Совета А.Лебедько, а также представители более двадцати молодежных организаций Беларуси.

Контактный телефон/факс 222-34-79.

Пикеты, проводимые активистами ОГП и Хартии'97, в которых участвуют известные общественные и политические деятели Беларуси

10 сентября возле ст. метро "Пролетарская" с 15 до 18 часов — **Татьяна Протько**, председатель Белорусского Хельсинкского комитета.

13 сентября на пересечении улиц Городской Вал и Немига с 16 до 18 часов — **Юлия Чигирь**, супруга экс-премьер-министра Михаила Чигиря.

14 сентября на бульваре Тракторостроителей с 16 до 18 часов — **Павел Козловский**, экс-министр обороны, председатель городской организации Объединенной гражданской партии.

15 сентября возле ст. метро "Пушкинская" в сторону гостиницы "Орбита" с 18 до 20 часов — **Станислав Шушкевич**, депутат Верховного Совета, председатель Белорусской социал-демократической громады.

Надвор'е

9—10 верасня па краіне захаваецца пераменная воблачнасць, пераважна без ападкаў, толькі 9-га ў паўднёва-ўсходніх раёнах месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Вецер усходні і паўночна-ўсходні — 4—9 м/с. Тэмпература паветра ўначы — +9...+14, удзень — +19...+24.

Пр. Анфісы, Пімена, Савы, Сцяпана.
К. Пятра, Сяргея, Якуба.

ВЕРАСЕНЬ
9
'99 ЧАЦВЕР

Усход 6.32
Захад 19.41
Даўж. дня 13.09

Маладзік
10 верасня
Усход 6.46
Захад 20.47

У магілёўскім друку з'явілася цікавая версія аб прычынах самазабойства тутэйшага банкіра Э.Шведава

Адна з версій прычын нядаўняга самазабойства ў Магілёве намесніка дырэктара тутэйшай філіі акцыянернага камерцыйнага банка "Пошук" Эдуарда Шведава з'явілася на старонках грамадска-палітычнай газеты "Веснік Магілёва". Са спасылкай на крыніцу, якая пажадала застацца інкогніта, журналіст гэтага выдання паведаміў аб ранейшай працы Эдуарда Шведава на пасадзе першага сакратара Магілёўскага гаркама КПБ. Як паведамляе газета, "пасля імклівага развалу партыі і дзяржавы (маецца на ўвазе СССР — БелаПАН.) партыйныя грошы ў тэрміновым парадку раздаваліся ў больш-менш надзейныя рукі. Частка гэтых грошай быццам бы дасталася і Э.Шведаву, які ўзначаліў Магілёўскую філію АКБ "Пошук". Перад ім, як і перад іншымі, была пастаўлена задача да лепшых часоў захаваць, а калі атрымаецца, і павялічыць грошы партыі. Далей крыніца ківала на нейкія няўдалыя фінансавыя аперацыі банкіра і нявернутыя крэдыты.

Кіраўнікі пракуратуры Магілёўскай вобласці сувязь паміж Эдуардам Шведавым і "грашыма партыі" каменціраваць адмовіліся, спаслаўшыся на адсутнасць такой інфармацыі.

Канстанцін УВАРАЎ.

Абмежаванні на пазабіржавым валютным рынку

Пастановай Нацыянальнага банка Беларусі ўведзеныя абмежаванні на здзелкі куплі-продажу замежнай валюты, якія ажыццяўляюцца банкамі і суб'ектамі гаспадарання на пазабіржавым валютным рынку. У прыватнасці, па-за асноўнай і дадатковай гандлёвых сесій Беларускай валютна-фондавай біржы ажыццяўляюцца здзелкі куплі замежнай валюты ўпаўнаважанымі банкамі ў суб'ектаў гаспадарання, якія з'яўляюцца іх кліентамі, у суме менш за 1000 адзінак адной з замежных валют у дзень па кожным суб'екце гаспадарання; здзелкі продажу замежнай валюты ўпаўнаважанымі банкамі суб'ектам гаспадарання, якія з'яўляюцца іх кліентамі, у суме менш за 1000 адзінак адной з замежных валют па кожным кантракце (здзелцы, аперацыі) і па кожным суб'екце гаспадарання, але не больш за 1000 адзінак замежнай валюты ў дзень; здзелкі куплі-продажу замежнай валюты паміж упаўнаважанымі банкамі ў суме менш за 1000 адзінак адной з замежных валют у дзень па кожным упаўнаважаным банку; здзелкі куплі-продажу замежнай валюты, што ажыццяўляюцца з дазволу Нацыянальнага банка Беларусі або галоўных упраўленняў Нацыянальнага банка па абласцях і Мінску.

Ягор ЗВОННІКАЎ, БелаПАН.

Позиция

4 сентября в Минске состоялось собрание 35 представителей, делегированных более чем 500 избирателями из 27 районов и городов Беларуси, на котором было решено создать оргкомитет по подготовке Учредительного съезда общественного движения "За демократические и свободные выборы". Председателем оргкомитета единогласно был избран председатель Верховного Совета 12-го созыва Мечеслав Гриб. В составе оргкомитета для подготовки проведения Учредительного съезда образованы четыре комиссии: организационная — председатель Владимир Гудеев, по разработке программных и уставных документов — председатель Михаил Плиско, по связям с общественными и международными организациями — председатель Мечеслав Гриб и информационная — председатель Владимир Михеев. Предполагаемая дата проведения Учредительного съезда — начало декабря текущего года.

Обращение

оргкомитета по созданию общественного движения "За демократические и свободные выборы" к гражданам и общественным объединениям Республики Беларусь

Мы считаем, что основным средством решения конституционного кризиса в Беларуси являются демократические и свободные выборы парламента и президента. Проведение таких выборов будет зависеть не только от содержания законодательных актов, регулирующих их проведение, но и от установления действенной системы общественного наблюдения за ходом избирательного процесса.

Осознавая важность проблемы, 4 сентября 1999 года в г.Минске 35 представителей, делегированных более чем 500 избирателями из 27 районов и городов Беларуси, решили создать оргкомитет по подготовке Учредительного съезда общественного движения "За демократические и свободные выборы".

В это движение могут войти как члены всех общественных объединений Беларуси, так и рядовые избиратели, члены избирательных комиссий, чиновники и предприниматели, руководители предприятий и хозяйств, интеллигенция и студенты, пенсионеры и домохозяйки.

Мы не преследуем цели прихода к власти, не претендуем на ведущую роль в политическом процессе и не собираемся подменять политические партии в борьбе за власть. Основная задача движения — обеспечить возможность проведения открытых и честных выборов и референдумов в Беларуси, помочь их организовать и провести без нарушений избирательного законодательства, обеспечив тем самым в Беларуси возможность избрания легитимной власти.

Мы обращаемся ко всем неравнодушным гражданам, членам общественных объединений с призывом поддержать нашу инициативу. В том случае, если движение станет массовым, мы сможем направить своих представителей во все избирательные комиссии и на все участки для голосования.

Контактные телефоны: **285-56-84, 283-74-50.**

Народная Воля 9 ВЕРАСНЯ 1999 г.

Беларускамоўная адукацыя сёння — гарант незалежнасці Бацькаўшчыны заўтра!

Паважаны сябра!

Ты, напэўна, ведаеш, што ў 1999 годзе тысячы юнакоў і дзяўчат атрымалі сярэднюю адукацыю ў школах з беларускай мовай навучання. Але дагэтуль яны не маюць магчымасці атрымаць вышэйшую адукацыю **на беларускай мове**! У нашай краіне 42 дзяржаўныя рускамоўныя вышэйшыя навучальныя ўстановы і — ніводнай, дзе б выкладанне вялося на беларускай мове. ТБМ імя Францішка Скарыны патрабуе ад уладных структур дзяржавы адкрыцця Нацыянальнага універсітэта з навучаннем на беларускай мове.

Запрашаем прыхільнікаў роднай мовы прыняць удзел у мітынгу, прысвечаным праблемам беларускамоўнай адукацыі, які адбудзецца з дазволу гарвыканкама **9-га верасня 1999 года з 17.00 да 19.00** у Мінску на плошчы перад Палацам чыгуначнікаў (вул. Чкалава).

Праезд тралейбусамі №№ 2, 11, 18, 27, 43, 51, 59; аўтобусамі №№ 10, 40, 45, 47, 53, 73, 82 (прыпынак "Гасцініца "Спутнік"); метро (станцыя "Інстытут культуры" і трохі прайсці ў бок аэрапорта).

Сакратарыят ТБМ.

Прадпрымальнікі Мазыра маюць намер аб'яднацца ў грамадскую арганізацыю

Прадпрымальнікі Мазыра, якія прынялі ўдзел у акцыі пратэсту супраць увядзення ў дзеянне некаторых палажэнняў дэкрэта А.Лукашэнкі N 14 ад 4 жніўня 1997 года "Аб некаторых захадах па ўпарадкаванні эканамічных адносінаў", вырашылі аб'яднацца ў грамадскую арганізацыю. Пра гэта паведаміў адзін з актывістаў ініцыятыўнай групы па стварэнню новай арганізацыі Анатоль Вілкоў.

У Мазыры працуюць каля 2 тысяч прыватных прадпрымальнікаў, і ўсе яны аднадушна выказалі свой пратэст супраць узнікшай пасля 1 верасня сітуацыі (часу ўступлення ў сілу некаторых палажэнняў дэкрэта Лукашэнкі № 14), калі "гандляваць стала проста небяспечна". Многія з іх збіраюцца ўвайсці ў склад ствараемага Незалежнага саюза прадпрымальнікаў Мазыра — так вырашана назваць новую арганізацыю.

Паводле слоў А.Вілкова, гарадскія ўлады адрэагавалі вельмі хутка. З прыватнымі прадпрымальнікамі сустракаліся старшыня гарвыканкама Іван Замулка, старшыня гарсавета Вольга Арцёменка, прадстаўнікі падатковай інспекцыі і аддзела фінансавых расследаванняў. Анатоль Вілкоў паведаміў таксама, што кіраўніцтва горада паабяцала давесці пра ўзнікшыя складанасці ва ўрад краіны і адміністрацыю прэзідэнта.

Ірына МАКАВЕЦКАЯ.

Расійскае піва "Неўскае" не горш беларускага "Старажытнага". Але ў пяць разоў даражэй...

Не бяруся сцвярджаць "на ўсе сто", але наўрад ці ёсць яшчэ такая краіна ў свеце, акрамя Беларусі, дзе б у крамах звычайнае піва каштавала даражэй за гарэлку.

Зрэшты, у тых, дзе самому даводзілася бываць, за кошт адной пляшкі гарэлкі (прычым не самай дарагой) можна набыць не менш за паўвядра добрага піва. А вось у беларускім горадзе Пінску ў краме №8 пры кошце пляшкі беларускай гарэлкі 300 тысяч рублёў побач прадаецца некалькі гатункаў расійскага піва тыпу "Афанасий" альбо "Невское", кошт якіх пачынаецца з 350 тысяч. Паколькі таннага беларускага піва вельмі часта, асабліва летам, у продажы няма, то, зразумела, выбар робіцца пераважна на карысць гарэлкі. Вельмі падобна на дзяржаўную палітыку: выпі гарэлкі і ні пра што не думай, а ад піва якая карысць?

І яшчэ. Тыя, хто шмат бывае ў Расіі, кажуць, што там беларускае піва каштуе прыкладна аднолькава з мясцовым і паўсюль "Крыніцы", "Льва" ды "Старажытнага" вельмі шмат. Такім чынам, яшчэ адзін відавочны вынік інтэграцыі — мы ў Расію, нават сабе не пакідаючы, прадаём добрае беларускае піва танна, а нам назад прысылаюць у пяць разоў даражэйшы "Афанасий".

Аляксей ДЗІКАВІЦКІ.

Стоп-кадр



Эти снимки сделаны на днях на торговом рынке в Ждановичах, где предприниматели приостановили работу, протестуя против произвола чиновников.

На снимках: *пустые прилавки; на стихийном митинге выступает один из лидеров предпринимательского движения Екатерина Наумович.*

Фото IREX/ProMedia.

Поле ведаў не дабавіць

Пакуль на розных узроўнях ідуць размовы, што распачатая рэформа школы лепш будзе даваць дзецям веды і рыхтаваць да жыцця, на месцах усё застаецца па-ранейшаму. Калі віцебскія школьнікі сёлета не будуць прыцягвацца да ўдзелу ў сельгасработах, то ў глыбінцы галоўную стаўку апроч студэнтаў і навучэнцаў ПТВ зноў зрабілі на безадмоўных дзетак. Так, у самым буйным і аддаленым Пастаўскім раёне цэлы месяц будуць заняты працай у полі 18 груп з мясцовага ПТВ №165. Ад паслуг сталічных студэнтаў зараз тут адмовіліся, аднак на два тыдні накіравалі збіраць бульбу, падымаць лён усіх школьнікаў базавых і сярэдніх школ. Замест дзяцей маглі б папрацаваць у полі больш як 900 беспрацоўных, але на гэтую працу ў калгасы ездзяць каля 200 чалавек. Між іншым, больш як 40.000 школьнікаў вобласці (або кожны пяты) знаходзяцца на дыспансерным уліку ў паліклініках, а здароўе падлеткаў увесь час пагаршаецца.

Уладзімір ШЫМОЎСКІ.

Крымінал

Маладая, ды сквапная

Прага лёгкага абагачэння вельмі часта бязлітасна ламае чалавечыя лёсы. У такой сітуацыі апынулася сімпатычная дзяўчына з вёскі Рубеж Браслаўскага раёна. Пасля заканчэння інстытута яна здолела ўладкавацца на працу галоўным бухгалтарам у Нацыянальны парк "Браслаўскія азёры". Не маючы сваёй сям'і, малады спецыяліст жадала жыць прыпяваючы і на працягу апошніх дваццаці месяцаў сваёй дзейнасці ўкрала з касы магутнай прапрэзідэнцкай структуры больш як адзін мільярд рублёў. Па ўзбуджанай па гэтым факце крымінальнай справе мінімальны тэрмін пакарання прадугледжвае пазбаўленне волі тэрмінам на 8 гадоў. Пакуль жа ідзе следства, праваахоўным органам прыйдзецца разабрацца, якімі матывамі карыстаўся дыпламаваны злодзей, перш чым рашыўся пайсці злачынным шляхам.

Уладзімір ШЫК.

Взгляд экономиста

Степан БРОВАР

Отключение горячей воды... Это первый звонок

Во второй половине августа жильцы некоторых районов Минска были озадачены: без всякого предупреждения в их квартирах исчезла горячая вода. Как пояснили власти, это был первый опыт так называемого веерного отключения с целью экономии энергоресурсов. Опыт, кстати, уже давно апробированный в большинстве государств СНГ на начальных этапах экономических реформ, когда они осуществляли первые шаги по структурной трансформации своей экономики. И столкнулись с необходимостью зарабатывать деньги для оплаты энергоресурсов. С тех пор много горячей воды утекло по трубам — большинство из этих государств давно решили вопросы оплаты российских энергоносителей и научились использовать их рационально.

Теперь приходит черед учится и Беларуси. Как оказалось, после трех лет бурного экономического роста, который ненавязчиво ставился в пример соседям по СНГ, Беларусь перед очередной зимой вдруг оказалась и без твердой валюты для закупки энергоносителей, и с плохим урожаем, и с очевидными признаками спада во внешнеэкономической деятельности.

Так, например, валовые валютные активы Национального банка сократились за январь—июль т.г. ровно на 50 млн. долларов, правительство начало заимствовать валюту населения, помещенную доверчивыми гражданами в государственный "Беларусбанк", для оплаты своих внешних долгов. Объем сельскохозяйственного производства упал в текущем году еще на 10%, а по урожайности зерновых белорусские колхозы, незаметно проскочив намеченный главой государства рубеж 1990 г., находятся где-то на пути к 1913 г. — любимому ориентиру развитого социализма. Еще большие кульбиты совершает внешняя торговля. При росте физического объема экспорта валютная выручка, включая бартер, упала почти на 20%, а импорт сократился на все 33%, т.е. белорусскую продукцию берут по дешевке, а продают столько, сколько в состоянии оплатить. Причем львиная доля такой внешней торговли (53%) приходится на Россию.

Как следствие, обеднело не только правительство, обеднели все предприятия и население страны. По официальной статистике, реальные денежные доходы сократились на 5%. И только Национальный банк постоянно и бодро рапортует о приросте денежных вкладов населения в банковской системе. Чего не может быть в стране, где уровень инфляции превышает процентные ставки по сбережениям населения и темп роста заработной платы. При темпе инфляции в 197% только за 7 месяцев этого года процентные ставки в "Беларусбанке" в 170—180% годовых (т.е. за 12 месяцев) успешно обесценивают любые сбережения. К примеру, срочные депозиты граждан на 1 января 1999 года составляли в банках страны 7,4 трлн., на 1 августа — 11,3 трлн. рублей (формальный рост — 152%). Реально, т.е. по покупательной способности с учетом индекса инфляции, они равнялись 1 августа 5,7 трлн. руб. Прямое обесценивание с учетом начисленных процентов составило 1,7 трлн. рублей.

Еще в худшей ситуации находятся те, кто хранит свои сбережения в наличных деньгах. Их обесценивание прямо пропорционально величине инфляции. Отсюда 64,5 трлн. бумажных "зайцев", которые находятся сейчас на руках населения, по покупательной способности равнялись 32,7 трлн. рублей на начало года. Что ненамного больше, чем их было в действительности, — 27,0 трлн. рублей.

Точно в таком же положении находятся и предприятия. Как бы они ни работали, с каждым днем становятся беднее. Если на 1 января 1998 г. на их текущих и срочных счетах имелось рублей на сумму, эквивалентную 994 млн. долларов, то на 1 августа т.г. уже только 720 млн. долларов.

Понятно, что белорусские рубли обесцениваются по причине инфляции, которая в свою очередь зависит от динамики падения его обменного курса по отношению к твердым деньгам. Но тогда возникает вопрос: почему так быстро падает обменный курс белорусского рубля? Причина же лежит на поверхности. Поддержка неэффективной государственной экономики, особенно сельского хозяйства, и финансирование непосильных для бюджета государственных программ, в частности — строительства, требуют средств. Не имея их, власти начинают печатать деньги, осуществляя так называемую денежную эмиссию, в результате чего национальных денег становится больше, чем имеющихся материальных ресурсов и валюты для их покупки. За 7 месяцев текущего года через подобный механизм в экономику было "вброшено" 35,3 трлн. рублей. В результате обменный курс начинает падать. И темпы этого падения определяются исключительно скоростью печатания денег. Чем быстрее Национальный банк печатает новые деньги, тем быстрее падают и рыночный, и официальный курсы.

Причем темп роста цен (инфляции) достаточно своеобразно зависит от них обоих. Сначала рыночная девальвация подгоняет рост цен, затем выросшие цены вынуждают власти к официальной девальвации. И если принять эту особенность в качестве неизбежной закономерности, то страну ожидает очередная инфляционная волна, пик которой придется на последние дватри месяца года.

С этой точки зрения летний темп роста потребительских цен оказался сравнительно умеренным и составил, например, в июле всего лишь 106%. За семь месяцев т.г. — 197,3%, или в среднем 10,2% за месяц, что в целом более чем в 2 раза превышает официальный среднемесячный макроэкономический прогноз на текущий год — 4—5%.

Основными факторами, позволившими добиться некоторого снижения темпа роста потребительских цен в середине года, являются: во-первых, замедление официальной и рыночной девальвации белорусского рубля в связи с сокращением внешнеэкономического оборота и спроса на валюту, во-вторых, сезонное снижение деловой активности реального сектора, в-третьих, это явилось следствием относительного сдерживания темпов роста рублевой денежной базы и ее общей массы в обращении после окончания весенней посевной в мае—июне. Определенную роль в этом процессе сыграли, очевидно, и регулирующие усилия государства по сдерживанию цен.

Но все эти факторы имеют определенные временные рамки. В частности, эффект поддержания официального курса рубля рано или поздно начинает "бить" по рентабельности предприятий, рыночный же курс очень живо реагирует на темп прироста рублевой денежной массы в экономике. Возникающие ножницы в обменных курсах, а точнее — увеличение разрыва между ними, заставляют делать выбор: либо рентабельность, либо низкий рост цен. Причем эти "ножницы" уже привычно прогрессируют во второй половине года, когда экономика, не "переварив" до конца весеннюю эмиссию, "подпитывается" новыми деньгами на уборочную.

Общая сумма прироста этого показателя за семь месяцев, как отмечалось, уже превысила намеченные за год 35 трлн. рублей (35,3 трлн.). На вторую половину года запланирована сверхплановая эмиссия в сумме еще около 40 трлн. рублей, которой, кстати, может тоже не хватить. Причем, учитывая оперативную подчиненность Национального банка правительству и стратегическую - главе государства, винить центральный банк за это вряд ли будет справедливо. В меру своих сил он пытается "связывать" свободные рублевые средства, но при отрицательной процентной ставке это не дает ожидаемого результата. Как правило, в белорусской финансовой системе эффект мультипликации кредитной эмиссии в денежную массу наиболее осязаемо проявляется с временным лагом в 1—1,5 месяца. Следовательно, темпы прироста рублевой денежной массы в последние три-четыре месяца года могут превысить 25—30% ежемесячно. А учитывая, что темп роста денежной массы, как правило, синхронизируется с рыночным понижением обменного курса белорусского рубля, можно без особого риска ошибиться, предположив, что его резкий "старт" уже в сентябре неизбежен. И что уже фактически началось — 570—590 тыс. рублей за безналичный доллар и 500 тыс. рублей — за наличный в конце августа.

Неизбежное увеличение курсовых "ножниц" между рыночным и официальным курсом автоматически предполагает постановку перед властями упомянутой выше дилеммы между рентабельностью и стабильностью цен. В прошлом году этот выбор помог решить российский финансовый кризис, под предлогом которого предприятия получили возможность "отпустить" цены. В этом году кризиса у соседей не предвидится, и очевидно власть предпочтет все-таки пожертвовать рентабельностью, продолжая административно препятствовать росту цен. Тем более что еще с начала года хозяйственникам была предоставлена льгота в виде отказа от переоценки основных фондов и снижения доли амортизационных отчислений в структуре производственных издержек. Но эти действия не могут быть продолжены дальше определенного рубежа, который определяется числом убыточных предприятий. А следовательно, тоже носит относительно краткосрочный характер. И чем больше курсовые "ножницы", тем короче период.

Исходя из этого, можно предположить, что в августе т.г. потребительские цены продержались на более или менее пристойном уровне (предположительно — менее 10%). Но начался интенсивный рост цен на промышленную продукцию, и в сентябре он начнет "давить" на цены потребительского рынка. Затем последует очередное повышение минимальной заработной платы, новый виток роста производственных затрат предприятий и цен.

Как известно, инфляция — это налог, который платят все без исключения, кто получает доходы в белорусских рублях. Но, изымая доходы в белорусских рублях через внутренний рост цен, государство не может использовать их во внешних расчетах. За газ и нефть нужны доллары и прочая СКВ. На худой конец — российские рубли. Их же надо зарабатывать, выпуская и продавая на внешних рынках конкурентоспособные товары. Это государству не под силу — оно всегда и везде было плохим собственником. Богатенький Запад в долг нам уже не дает. Скромные валютные средства у предприятий нужны им для собственного производства. Остались личные накопления населения в валюте, но граждане заметно поумнели и тоже не спешат нести доллары в государственные банки. За семь месяцев т.г. сумма валютных вкладов физических лиц в банках увеличилась всего лишь на 16,8% и достигла 194,3 млн. долларов (власти еще в прошлом году грозились привлечь до 500 млн.).

В итоге мы имеем инфляцию и не имеем валюты. И постоянно становимся еще беднее. Нынешние веерные отключения горячей воды — это пока лишь цветочки. Но если в Вильнюсе или Таллинне отключение отопления даже зимой совпало с началом реформ и последовавший экономический рост избавил их жителей от пониженной температуры в домах, то в Беларуси это — следствие отказа от реформ. И перспектив на улучшение при нынешней экономической политике не предвидится. Так что ягодки — еще впереди.

Аналитическая группа "Z".

Кинокухня

РасЦВЕТ "Беларусьфильма" откладывается на...

В кинематографической среде активно муссируются слухи о том, что нынешнего заместителя министра культуры Юрия Цветкова собираются назначить директором киностудии "Беларусьфильм". Кинематографисты в большинстве своем против. Но ничего поделать не могут: почти все решения Министерства культуры идут вразрез с мнением Союза кинематографистов. Поэтому киномэтры, собравшись на очередное правление Союза, решили написать письмо Лукашенко. Если он соблаговолит встретиться с кинематографистами — рассказать ему об истинном (читай — бедственном) положении дел в белорусском кино. Если нет — хотя бы получить разрешение Александра Григорьевича на право самостоятельного выбора директора киностудии. Правда, некоторые представители кинематографической элиты утверждали, что дело вовсе не в директоре, а в системе. В отсутствующем до сих пор законе о кино. И писать нужно не Лукашенко, а министру культуры...

Владимир Гостюхин:

— Пусть придет любой директор — он все равно ничего не сможет сделать. Потому что нет закона о кино и прокате. Бросит государство кинематограф, не бросит — это уже второстепенный вопрос. Будет желание снимать кино, будет хватать денег, поможет кто-то или сам найдешь деньги — это уже условная схема существования. Для кого снимать — тоже личное дело каждого. Пока самое главное — система проката и проект закона о кино.

Александр Карпов:

— Лично я государству не верю. На мой взгляд, разумно было бы попросить чиновников вообще не вмешиваться в кинематографические дела. На сегодняшний день государство больше тратит, чем получает от студии. Это предприятие не приносит никакого дохода. Оставили бы киностудию вообще, освободили бы лет на пять от налогов. Сразу бы появились деньги...

Юрий Хащеватский:

— Киностудию в покое не оставят, потому что "Беларусьфильм" — государственное предприятие. В принципе, я могу спокойно делать кино и без киностудии. И не только я. Кинематограф действительно может запросто существовать без "Беларусьфильма". Но на данный момент речь идет о взаимоотношениях, взаимопонимании между "Беларусьфильмом" и Союзом кинематографистов.

